View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

# ЖЫЦЬ І ПОМНІЦЬ (рэцэнзія)

Зусім нядаўна - 2 верасня 2015 года мы адзначылі 70-годдзе з дня сканчэння Другой сусветнай вайны. Яшчэ і сёння гісторыкі ўсяго свету не могуць прыйсці да адзінай думкі, колькі чалавек загінула ў час гэтай вайны. Называюць тры лічбы – 60 мільёнаў, 65 мільёнаў і нават 70 мільёнаў чалавек.

Ні адна краіна свету не панесла такіх вялікіх страт, як Савецкі Саюз. Афіцыйная лічба – каля 27 мільёнаў чалавек, хоць маскоўскія гісторыкі і музейныя работнікі даўно лічаць, што загінула не меней як 30 мільёнаў грамадзян СССР.

У жорсткіх баях на палях Еўропы загінула звыш мільёна савецкіх воінаў. На жаль, мы не можам сёння назваць дакладную лічбу. Усе яны здзяйснялі вызваленчую місію, і мы маем усе падставы назваць іх вызваліцелямі. Толькі ў баях за вызваленне Польшчы загінула звыш 600 тысяч салдат і афіцэраў Савецкай Арміі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Воінскія магілы, а пераважную большасць загінуўшых можна лічыць героямі, сёння густа рассеяны ад Буга на захад па еўрапейскім краінам.Пахаванні і мемарыялы воінаў Савецкай Арміі і савецкіх грамадзян раскіданы па многім краінам Еўропы-Германіі. Аўстрыі. Польшчы, Венгрыі. Чэхіі. Славакі, Італіі і іншых. Доўгі час у былым Савецкім Саюзе, на постсавецкай прасторы, у многіх еўрапейскіх краінах выйшлі розныя публікацыі, у тым ліку і кнігі, і фотаальбомы па дадзенай праблеме. Але да сённяшняга дня адсутнічала выданне, якое б падсумоўвала ўсе звесткі аб гэтых пахаваннях і мемарыялах.

І вось, нарэшце, яно з'явілася. Я маю на ўвазе кнігу А.В.Шаркова і А.І.Харашэвіч "Жить и помнить.: Советские воинские захоронения в Европе : Книга 1", якая выйшла зусім нядаўна ў Мінску, у "Выдавецкім доме "Звязда".

Безумоўна, гэта знакавая з'ява ў навуковым і культурным жыцці не толькі Рэспублікі Беларусь, але і ішых рэспублік былога Савецкага Саюза.

Рэцэнзуемае выданне, прысвечанае 70-годдзю Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне - першы вынік рэалізацыі ўнікальнага праекта, здзяйсняемага пад эгідай Усехсвятскага прыхода горада Мінска з благаславення яго настаяцеля Фёлара Поўнага. Ідэя праекта састаіць у тым.

каб сабраць матэрыял аб воінах, нашых суачынніках, якія загінулі за межамі нашай Радзімы ў гады Другой сусветнай вайны.

Вельмі добра, што менавіта гэтым праектам прадугледжана наведванне месцаў баёў,пошук воінскіх пахванняў, Іх вывучэнне, фотаз'ёмка,відэазапіс і ўзяцце зямлі з месцаў пахавання для крыпты праваслаўнага храма-помніка у гонар Усіх Святых і ў памяць аб ахвярах, якія паслужылі выратаванню нашай Айчыны, у Мінску.

Адна з вартасцей рэцэнзуемай кнігиі састаіць у тым, што вазданне памяці паўшых не толькі захавае і увекавечыць для нашчадкаў славу абаронцаў Айчыны, але і дазволіць родным і блізкім, не прадпрымаючы далёкую паездку на чужбіну да месцаў пахавання, дакрануцца да святыні-зямлі і памаліцца аб упакаенні душ загінуўшых.

Другой вартасцю кнігі А.В.Шаркова і А.І.Харашэвіч з'яўляецца тое, што яна дае верагодную інфармацыю аб месце захавання і яго стане.

Па-трэцяе, прынцыпова важна, што ў рэцэнзуемым выданні прадстаўлены ўсе катэгорыі ахвяр Вялікай Айчыннай вайны, якія знайшлі супакаенне у Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Польшчы, Чэхіі, Славакіі і Італіі. Гэта магілы ваеннаслужачых Савецкай Арміі,загінуўшых у баях або аддаўшых жыццё у імя захавання миру, замучаных у нацысцкіх канцлагерах, савецкіх грамадзян – прымусовых рабочых, памершых ад непасільнай працы, і непаўналетніх вязняў.

Па-чацвертае, асаблівую каштоўнасць мае раздзел "Германія". Яго змест – гэта пэўны уклад у гістарычную навуку, таму што многія маючыяся звесткі ва многіх энцыклапедыях і даведачных выданнях па гэтай праблеме недакладны ў даўно ўстарэлі.

Канстатуючы, шта на тэрыторыі Германіі улічана і знаходзяцца пад пастаянным дзяржаўнай аховай 3600 воінскіх пахаванняў, якія з'яўляюцца могілкамі каля 760 тысяч грамадзян былога СССР, аўтары кнігі адзначаюць, што на ўсходзе Германіі на 850 могілках знаходзіцца больш чым 420 тысяч савецкіх грамадзян. Сюды ўваходзяць 2100 расійскіх ваеннапалонных (расійскі бок прыводзіць лічбу ў 17 000 чалавек –Э.І.) перыяду Першай сусветнай вайны, больш 4000 савецкіх ваеннаслужачых перыяду Другой сусветнай вайны на 559 воінскіх пахаваннях, каля 17 тысяч савецкіх ваеннаслужачых і членаў іх сямей з былой Заходняй группы савецкіх войск у Германіі (ГСВГ).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Згодна навуковаму пошуку А.В.Шаркова і А.І.Харашэвіч. найбольш буйнымі пахаваннямі на ўсходзе Германіі знаходзяцца ў Цайтханне (Рыза) – каля 70 тысяч савецкіх ваеннапалонных – і ў Берліне (Панкаў) – каля 11 тысяч савецкіх салдат і афіцэраў.

Яны прыйшлі да высновы, што на захадзе Германіі на 2750 воінскіх пахаваннях пахавана каля 340 тысяч чалавек – ваеннапалонных расійскай і Савецкай Арміі Першай і Другой сусветных войн.. Найбольш буйнымі з іх знаходзяцца ў Штукенброк-Зенне (каля 65 тысяч савецкіх ваеннапалонных) і ў Берген-Бельзене (каля 50 тысяч савецкіх ваеннапалонных(.

Па-пятае, дзякуючы асабістым назіранням (а чытачы могуць гэта пацвердзіць, азнаёміўшыся з фотаматэрыяламі –Э. І.)) , аўтары кнігі прыйшлі да высновы, што ва ўсходніх федэральныхземлях большасць пахаванняў– ваенна-мемарыяльныя комплексы і могілкі. У той час як на тэрыторыі заходніх зямель гэта ў асноўным адзінкавыя магілы ваеннапалонных і асоб, прымусова угнанных на працы, размешчаныя на царкоўных або гарадскіх могілках,альбо брацкія магілы на тэрыторыі могілак былых канцлагераў.

Па-шостае, чытачам, якім неабыякава дадзена праблема, будзе цікава ведаць,што розніца ў відах пахаванняў абумоўлівае і іх стан. Індывідуальныямагілы на гарадскіх і царкоўных могілках утрымліваюцца, як правіла у добрым стане, на іх устаноўлены памятныя і надгробныя пліты з натуральнага камня, Што датычыцца буйных ваенна-мемарыяльных комплексаў ва ўсходніх федэральных землях – многія з іх патрабуюць дарагастоячага рамонту і мер па іх захаванню.Напрыклад, штогод на ўтрыманне мемарыялаў у Берліне і Трэптаў-парку, у Тыргартэне і ў Панкове выдзяляецца 1 млн. еўра. Усяго ж на штогоняе утрыманне ўсіх воінскіх пахаваанеў Урадам ФРГ выдзяляецца каля 25 млн. еўра, з якіх 70% ідзе на кампенсацыю расходаў мясцовай улады па ўходу і утрыманню пахаванняў. 30% прадугледжана на правядзенне рамонтна-аднаўленчых работ.

Падкрэсліваючы, што велізарная роля ў пошуках загінуўшых, іх пахаваннях , утрыманні магіл, могілак і мемарыялаў належыць Народнаму саюзу Германіі па ўходу за ваеннымі магіламі,створанаму яшчэ ў 1919 годзе, аўтары кнігі ўказваюць, што яго дзейнасць толькі на 10% аплачваецца з дзяржбюджэта, а асноўныя сродкі паступаюць ад дабраахвотных збораў і ахвяраванняў грамадзян.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Па-сёмае, рэцэнзуемае выданне характарызуецца ўмелым і прадуманым падборам фактычнага матэрыяла, дакладней, такіх фактаў, якія "уразаюцца" у памяць чытачоў. Так, у раздзеле "Польша" на стар.215 можна прычытаць такія радкі:

"Всем памятна история, когда ещё в 1981 г. Лех Валенса, бывший тогда лидером «Солидарности», узнав об оскорбительной надписи на одном из мемориалов павшим советским воинам, пришёл с ведром и тряпкой, чтобы лично смыть позор…».

Па-восьмае, вялікую каштоўнасць і цікавасць кніге А.В.Шаркова і А.І.Харашэвіч прыдае тое, што ў ёй прыведзены цудоўныя і рэдкія фотаматэрыялы па савецкім воінскім пахаванням у кожнай разглядаемай краіне, некаторыя з якіх друкуюцца ўпершыню. Прычым, яны выдатна, якасна афармленыі вельмі ўпрыгожваюць выданне.

Па-дзевятае, навуковую каштоўнасць кнігі павышае прывядзенне чатырох дакументальных дадаткаў. Гэта загад народнага Камісара абароны СССР № 138 з аб'явай палажэння аб персанальным уліку страт і пахаванні загінуўшага асабістага складу Чырвой Арміі ў ваенны час, спіс савецкіх ваеннапалонных, ураджэнцаў Беларусі, памершых у лагеры Цайтхайн, спіс пахаваных у г.Секешфехервар пасля 1956 г., спіс пахаваных на могілках пад Монтэ-Касіна.

Па-дзесятае, рэцэнзуемае выданне характарызуецца ўмелым спалучэннем навуковасці і папулярнасці.

Разам з тым хочацца выказаць некаторыя пажаданні, якія неабходна ўлічыць пры выданні дадатковага тыража кнігі або яе другім выданні.

Так, на стар.8 сцвярджаецца:

"Так. в 1966 г. между Федеративной Республикой Германией і Республикой Беларусь было подписано межправительственное соглашение "Об уходе за военными могилами",которое, кстати, до сих пор не ратифицировано".

Трэба адзначыць, што ў 1966 годзе яшчэ не існавала " Рэспублікі Беларусь". Яна з'явілася на палітычнай карце свету толькі 19 верасня 1991 года.

Пры апісанні магіл, мемарыялаў і могілак у розных краінах Еўропы, разглядаемых у рэцэнзуемам выданні, было б пажадана, дзе гэта вядома,

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

прывесці асобнахоць бы нейкія звесткі аб загінуўшых беларусах і ўраджэнцах Беларусі.

У рэцэнзуемым выданни адсутнічае спіс выкарыстаных крыніц.

У кнізе прыводзяцца, як правіла, толькі станоўчыя факты. Але за апошнія гады у шэрагу краін былі і выпадкі адмоўных адносін да захаання савецкіх воінскіх пахаванняў. На жаль, весткі аб такіх выпадках адсутнічаюць.

Думкі не толькі вернікаў, але ўсяго беларускага народа добра выразіў мітрапаліт Філарэт, Ганаровы Патрыааршы Экзарх усёй Беларусі ў наступных радках звароту да чытачоў гэтага выдання:

“Выход в свет книги «Жить и помнить», посвящённой воинам, павшим за освобождение Европы, является знаковым событием. Изданная в год 70-летия Великой Победы над фашистской Германией книга поистине олицетворяет и сохраняет память о судьбах тысяч людей и служит напоминанием о той роли, которую сыграли советские войска в судьбе Европы и всего мира».

Многія чытачы “Настаўніцкай газеты” чакаюць працягу праекта, дакладней другой, а можа і трэцяй кнігі аб савецкіх воінскіх пахаваннях у Румыніі, Балгарыі. Сербіі, Харваціі, Францыі, Бельгія, Галандыі, Люксембургу, Нарвегіі, Фінляндыі і ішых краінах Еўропы.

Нельга не згадзіцца з думкай аўтараў кнігі, выказанай імі ў першым абзацу “Прадмовы”:

“Память о прошлом…Нет,это не просто свойство человеческого сознания, его способность сохранять следы минувшего. Память – это связующее звено между прошлым и будущим. Она не нейтральна, не пассивна. Она учит и призывает, убеждает и предостерегает, даёт силы и внушает веру. Из памяти народной мы черпаем силы для новых свершений. Она вдохновляет на труд и на подвиг. Вот почему наш народ так благоговейно чтит память о подвигах тех,кто не жалеет ни сил, ни самой жизни в борьбе за светлое будущее своей Родины. И чем меньше остаётся живых свидетелей прошлого.,тем больше всенародная забота о его сохранении в вечной памяти благодарных потомков».

Беларускі гісторык і юрыст, доктар гістарычных навук, прафесар Анатоль Шаркоў і журналіст і перакладчык Алена Харашэвіч стварылі

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

каштоўную, ва многім унікальную кнігу. Яна будзе карысна не толькі ветэранам Другой сусветнай вайны,ветэранам военнай службы, супрацоўнікам дзяржаўных і ваенных структур, вучоным-гісторыкам, моладзі нашай рэспублікі, дзесяткам тысяч настаўнікаў гісторыі, класным кіраўнікам, дырэктарам і завучам сярэдніх спецыяльных устаноў, прафесарска-выкладчыцккму складу вышэйшых навучальных устаноў, беларускаму студэнцтву, але і шырокаму чытачу, які цікавіцца не толькі гісторыяй Вялікай Айчыннай вайны, але і праблемамі ўвекавечвання памяці аб загінуўшых савецкіх воінах – вызваліцелях Еўропы ад германскага нацызму.

Эмануіл Рыгоравіч Іофе, ваенны гісторык, прафесар БДПУ імя М.Танка, доктар гістарычных навук

220005. Г.Мінск, пр.Незалежнасці, 39-90. Т.2-84-83-79.

Настаўніцкая газэта 19 верасня 2015 г

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ